каторы жыве сумежна зь імі. І з Варшавы чуем голас, каторы хоча навярнуць нашых „тутэйшых“ палякаў (у большай часьці апалячаных беларусаў) на новую, справядлівую дарогу.

У № 487 газэты „Słowo“ ў стацьці „Zagadka dziejowa“[2], падпісанай *„Ja“* (здаецца, чалавекам з нашага краю), аўтар кажа, што ў Беларусі „на польскую шляхту набліжаецца небесьпячэнства зь дзьвюх старон: ад расейскага нацыяналізму і ад тых мужыцкіх народаў, каторыя будзяцца да нацыянальнага жыцьця і хочуць быць гаспадарамі ў старонцы, якую лічаць сваей. Расейскі нацыяналізм — гэта сіла благая; ён нарадзіўся з благіх, проціграмадзянскіх інстынктаў — жаданьня абіраць і зьніштажаць“. Проці яго раней ці пазьней пойдзе ўся Расея, і ён счэзьне, як дым. Калі ж палякі будуць лучыцца зь ім, дык і іх чакае гібель ад другога небесьпячэнства — ад мясцовых адвечных насельнікаў Беларуска–Літоўскага краю. А гэтае небесьпячэнства можа быць вялікшым за першае. „Адраджэньне народу да нацыянальнага жыцьця — гэта рэч зусім натуральная; яно павінна наступіць пры агульным разьвіцьці грамадзянства, гэта — гістарычная канечнасьць. Благія варункі могуць такі рух затрымаць на доўгі час, але ніколі не здалеюць затушыць яго“. Патрыятычныя жаданьні беларусаў і літвінаў маюць вялікую будучыну і здабываюць сымпатыю „кожнага справядлівага чалавека на цэлым сьвеце“. І таму аўтар стацьці радзіць палякам на Беларусі і ў Літве трымацца адзінай мудрай праграмы: „зьвярнуцца гарачым сэрцам да тутэйшага народу, шчыра заняцца яго нядоляй, яго патрэбамі, яго жаданьнямі, памагаць яму разьвівацца ва ўсіх кірунках, ...несьці ўсё добрае і шчыра апекавацца пакрыўджанымі жыцьцём народнымі масамі“. Іншай дарогі для тутэйшых палякаў няма. Бо не расейскі нацыяналізм іх тутака можа зьніштожыць, „заліе патоп народны“. Але нават у такім прыпадку, калі палякі загінуць у беларуска–літоўскім народным моры, „астанецца хаця добрая памяць аб польскім імені, на каторай будзе апірацца добрая згода Польшчы з народамі–суседзямі“.

Так піша „Słowo“. Ці толькі патомкі слаўных ваякаў за „свабоду народаў“ захочуць паслухаць гэтай рады, ці ўступяць дарогу тым маладым народам, што сьмела ідуць да новага жыцьця? Пажывем — пабачым.

## „Падаходны“ налог і даходы жыцеляў у Расейскім гасударстве

За прыкладам заграні́чных гасударств маняцца і ў нас завясьці падатак ад даходу, які мае плаціць кожын грамадзянін, калі даход яго ня меншы за тысячу руб. у год. Міністэрства фінансаў, каторае напісала ўжо праект новага закона аб падатку ад даходу, сабрала за 1909 і 1910 год ведамасьці аб тым, колькі людзей павінна плаціць новы налог, колькі грошай зарабляюць яны і які прыбытак будзе з гэтага меці гасударственая казна.

З рахункаў міністэрства бачым, як дзеляцца жыцелі аграмаднага 160–мільённага Расейскага гасударства павэдлуг свайго багацьця. Выходзіць, што больш 1000 руб. зарабляе у нас толькі 696 тысяч 700 чалавек, бо на гэтулькі душ мае быць наложаны новы падатак. Гэта невялікая жменя людзей (ведама, невялікая, калі прыраўнуем да ліку ўсіх жыцеляў Расеі) мае даходу ў год 2 мільярды 644 мільёны 700 тысяч рублёў (2 644 700 000), з каторых у казну павінна пайсьці 64 з палавінай мільёны рублёў. Праўда, што пры гэтым часьць цяперашніх налогаў (за кватэры, з фабрык) будзе скасавана, а іншыя паменшацца, дык ад тых 64 з палавінай мільёнаў трэба адкінуць якіх 19 млн. руб.; усё ж і тагды новы падатак павялічыць даходы гасударства на 45 зь лішкам мільёнаў.

З фабрык і гандлю даход усіх людзей, што зарабляюць больш тысячы ў год, пераскочыў за 856 мільёнаў; далей ідзе даход з асабістай працы — 760 мільёнаў, зь зямлі — 412 млн., з капіталаў — 340 м., з дамоў і пляцаў па гарадох — 275 з палавінай млн. руб. Блізка палова гэтых грошай складаецца з драбнейшых даходаў — ад 1 да 5 тысяч, і дастаюць іх блізка 88 працэнтаў усіх тых, што па закону павінны будуць плаціць новы падатак. А другая

палавіна — 1 428 мільёнаў — астаецца на долю 8 з палавінай тысяч душ (наагул, значыць, на кожную па 168 тысяч руб. у год).

Лічба плацельшчыкаў падаходнага падатку ёсьць жывым знакам заможнасьці народу; гэта кожны лёгка сам зразумець можа. У Расеі на 230 душ жыцеляў прыходзіцца толькі адзін такі плацельшчык, і з гэтага відаць, што хаця вялікае і абшырнае Расейскае гасударства мае аграмадныя натуральныя (прыродныя) багацтвы, але народ ня лішне сытна жыве. І многа–многа трэба яшчэ працы палажыць, каб паднялася заможнасьць усяго нашага народу, каб як можна болей людзей карыстала з тых дароў, якія прыгатавала для ўсіх нас Зямля–Матка.

## Справа аб беларускай школе ў Думе

Калісь — некалькі сот лет таму назад — блізка па ўсей Заходняй Эўропе завёўся такі абычай: якой веры быў гасудар старонкі, такой павінны былі трымацца і ўсе яго падданыя. Бывала, што па сьмерці валадзецеля краю яго мейсца займаў насьледнік, каторы трымаўся другой рэлігіі і прымушаў тысячы падвластных яму людзей перамяняць веру; бывалі і яшчэ горшыя рэчы... І гэты благі звычай так скрозь умацаваўся, што стаў як бы міжнародным законам; выражаўся ён чатырма лацінскімі славамі: *„cuius regio, eius religio“* — „чыё каралеўства, таго і вера“[1].

Многа вады ўплыло ад тых часоў, і аб гэтым законе жыве між людзьмі адно толькі благі ўспамін... Усё ярчэй і ярчэй высоўвае жыцьцё на яго месца другі закон, каторы пазнаем, калі ў старым пераставім словы. Гэта будзе: *„cuius religio, eius regio“* — „чыя вера, таго ўласьць“, разумеючы пад словам „уласьць“ пераважванньне аднэй нацыі, аднэй культуры над другою.

Новы закон жыцьця найбольш выяўляецца на Ўкраінскай Русі і ў Беларусі, ня кажучы аб рожных заморскіх краёх. Так, у Галіччыне (у Аўстрыі), дзе жывуць украінцы, побач з староньнікамі абрусеньня ўкраінскага народу бачым людзей, каторыя, карыстаючы з сваей духоўнай уласьці, стараюцца ўкраінцаў–каталікоў перарабляць на палякаў (гл. „Goniec Codz.“ № 205 z dnia 13/XI 1910 г. „Ks. arcyb. Bilczewski o spisie ludności“[2]). Падобныя справы робяцца і ў Расейскай Украіне, ды гэта ж самае бачым мы ў Беларусі: тут лічаць, быццам каталіцтва — гэта польская вера, праваслаўе — расейская („руская“), і прыродных беларусаў запісваюць паводлуг рэлігіі то ў палякі, то ў рускія.

Такую думку ўвагналі беларусу ў галаву людзі, каторым гэта карысна, толькі дзякуючы цемнаце нашага народу, недахвату у яго нацыянальнай сьвядомасьці. Цёмны земляроб ня ведае, што быць праваслаўным яшчэ ня значыць быць рускім, як быць каталіком ня значыць быць палякам. Ён ня ведае, што рэлігія — гэта справа толькі сумленьня чалавека і нічога супольнага зь яго нацыянальнасьцю ня мае; ня ведае, што, апрача рускіх, ёсьць праваслаўныя грэкі, румыны, баўгары, сэрбы і другія народы, а каталіцкай веры трымаюцца італьянцы, французы, часьць немцаў, увесь гішпанскі і партугальскі народ, літвіны, чэхі, харваты і т. д., палякі ж — гэта толькі адзін з членаў у сям'і каталіцкіх народаў. Ён ня ведае, наканец, што ў Пецярбурзе ёсьць цэлая грамада рускіх каталікоў, каторыя маюць свой касьцёл, дзе адпраўляюць набажэнства па–расейску і з палякамі нічога супольнага ня маюць; ня бачыць ён, што ў нас на Беларусі жыве таксама багата праваслаўных палякоў...

Карыстаючы з гэтага нязнаньня, дэпутат ад Віленскай губ. кс. Мацяевіч дамагаўся ў Гас. Думе, каб у пачатковых школах навучалі дзяцей беларусаў–каталікоў па–польску, а сьвяшч. Юрашкевіч (ад Мінскай губ.) падаў праект, каб беларусы вучыліся не па–свойму, а толькі па–расейску. Дума першы праект адкінула, але апошні зацьвердзіла: пераважылі „акцябрысты“[3] і „правыя“[4] і іх галасамі забаронена беларусам і ўкраінцам вучыцца ў школах у роднай мове. А нашы мужыцкія дэпутаты, седзячы разам з „правымі“, падалі і свае галасы проці роднае мовы ды гэтак адракліся ад яе...